**Урок беларускай мовы па тэме “Займеннік як часціна мовы: агульнае значэнне, марфалагічныя прыметы, сінтаксічная роля. Пачатковая форма. Разрады займеннікаў па значэнні”**
**(6 клас)**

**Міцкевіч Тамара Мікалаеўна,**
настаўнік беларускай мовы і літаратуры
вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі
гімназіі Шчучына

**Урок з’яўляецца ўводным па тэме “Займеннік”. Ён распрацаваны з апорай на тэхналогію развіцця крытычнага мыслення праз чытанне і пісьмо, якая спрыяе развіццю ў вучняў навыкаў мыслення, умення ставіць перад сабой мэты, самастойна набываць патрэбныя веды, прымяняць іх на практыцы, бачыць праблемы і шукаць шляхі іх вырашэння. Этапы ўрока аб’яднаны тэмай “Прырода і чалавек – адно цэлае”, прымеркаванай да Дня Зямлі.**

**Мэта:** арганізацыя пазнавальнай дзейнасці па засваенні вучнямі паняцця пра займеннік як часціну мовы.

**Задачы:**

– садзейнічаць практычнаму засваенню стылістычнай своеасаблівасці ўжывання некаторых займеннікаў у маўленні, спрыяць фарміраванню камунікатыўна-маўленчай кампетэнцыі, развіццю памяці, увагі, мыслення, умення аналізаваць вучэбны матэрыял, характарызаваць, даказваць, складаць апорныя схемы па тэме, рабіць высновы;

– спрыяць развіццю культуры маўлення;

– садзейнічаць выхаванню патрыятычных пачуццяў, выхоўваць беражлівыя адносіны да прыроды і навакolля.

**Абсталяванне:** вучэб. дапам. па беларускай мове для 6-га класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання Валочка Г.М., Зелянко В.У., Мартынкевіч С.В., *Мн.”Нацыянальны інстытут адукацыі” 2020., магнітная дошка, магніты, карткі з дыдактычным матэрыялам; лісты паперы для групавой работы, фламастары*;*“Тлумачальны слоўнік беларускай мовы”. Баханькоў А. Я., Гайдукевіч І. М., Мн.,” Народная асвета” 1990.*

## Ход урока

**I. Арыентацыйна- матывацыйны этап**

1. Уступнае слова настаўніка. Знаёмства з планам дзейнасці на ўроку.

2. Актуалізацыя суб’ектыўнага вопыту.

Вучням прапануецца суаднесці выразы з датамі (на дошцы размешчаны карткі ў пэўнай паслядоўнасці, прыём “Мазгавы штурм”).

| | |
|---|---|
| Дзень аховы навакольнага асяроддзя | 5 чэрвеня |
| Дзень памяці ахвяр на ЧАЭС | 26 красавіка |
| Акцыя “Дзень без аўтамабіля” | 22 верасня |
| Сусветная акцыя “Гадзіна Зямлі” | 29 сакавіка |
| Міжнародны дзень энергазберажэння | 11 лістапада |
| Дзень Зямлі | 22 красавіка |

Пытанні вучням:

– Ці прымаеце вы ўдзел у прапанаваных акцыях?

– Як вы лічыце, якой тэмай будуць аб’яднаны этапы ўрока?

(*Тэма прыроды, ахова наваколля, беражлівыя адносіны да прыроды…)*

– Да якой асноўнай даты прымеркавана тэма аховы прыроды?

*(22 красавіка – Дзень Зямлі.)*

*Індывідуальнае заданне для вучня.*

*Даведка:*

Дзень Зямлі

22 красавіка адзначаецца Дзень Зямлі. Ідэя правядзення экалагічнага свята належыць амерыканскаму вучонаму. Упершыню акцыя прайшла ў ЗША ў 1990 годзе. Яна сабрала дваццаць мільёнаў чалавек. Удзельнікі чыталі лекцыі па ахове прыроды, саджалі дрэвы. У 1990 годзе Дзень Зямлі стаў міжнародным. У гэты дзень кожны можа дапамагчы прыродзе. Звычайна Дзень Зямлі святкуецца 22 красавіка. Але многія адзначаюць Тыдзень Зямлі ці Месяц Зямлі. Нехта святкуе яго ў дзень вясенняга раўнадзенства 21 сакавіка. А нехта 5 чэрвеня ў Дзень аховы навакольнага асяроддзя. На самай справе кожны дзень павінен стаць Днём Зямлі! (*Паводле І. Бышнёва.*)

Пытанне вучням:

– З якой мэтай была ўсталявана гэтая дата?

(*Дата была ўсталявана з мэтай штогод нагадваць чалавецтву пра страшэнныя экалагічныя катастрофы і заклікаць кожнага задумацца аб тым, чым ён можа дапамгчы ў вырашэнні экалагічных праблем*).

**Настаўнік.** Дэвізам нашага ўрока будуць словы народнага паэта Беларусі П. Панчанкі:

*“Сябры, давайце будзем хвалявацца*
*За ўсіх, за ўсё: за зерне і дзіця…”*

– Якую думку хоча данесці нам П. Панчанка? *(Мы павінны клапаціцца пра ўсё жывое на зямлі, пра будучыню дзяцей, пра будучыню нашай планеты…* )

***ІІ. Матывацыйна-арыенціровачны этап***

1. Настаўнік агучвае тэму ўрока, стварае ўмовы для вызначэння мэты і задач урока.

<u>Пытанні вучням:</u>

– Што вам вядома па тэме?

– Якую мэту і задачы вы паставіце перад сабой?

2. Складанне плана вывучэння тэмы на картках (*карткі мацуюцца на дошку*):

Займеннік як часціна мовы:

– агульнае значэнне,

– марфалагічныя прыметы,

– сінтаксічная роля,

– пачатковая форма,

– разрады займеннікаў па значэнні (азнаямленне).

3. Зварот да другога эпіграфа:

*"Багатым стане той, хто навучыцца цаніць тое, што ў яго пад нагамі, берагчы тое, што ён бачыць вачамі, ахоўваць тое, што чуе вушамі"* (японская прыказка).

<u>Пытанні вучням:</u>

– Што знаходзіцца ў нас пад нагамі? Што ў нас перад вачамі? (*Зямля з яе прыроднымі багаццямі, з яе дзівоснай прыгажосцю…)*

–Як разумеце сэнс выслоўя?

– Назавіце самастойныя часціны мовы, якія ўжыты ў прыказцы (*назоўнікі, прыметнікі, дзеясловы, займеннікі).*

– Назавіце займеннікі (*той, хто, тое, што, яго, ён,…).*

– Па якіх прыкметах вылучылі, што гэта займеннікі?

4. Работа над практыкаваннем 412*(вусна).*

**Настаўнік**. Прачытайце тэкст "Ад роду да народу".

**Я,Ты, Ён, Яна** – людзі на планеце Зямля.

У кожнага чалавека сваё **Я**. Кожны чалавек – Асоба! Кожнае чалавечае жыццё – Кніга!

А сам чалавек – гэта цэлая планета.

А як бы чалавек ні выстаўляў сваё Я, ён заўсёды павінен помніць пра сваіх бацькоў і дзядоў. За сто гадоў мяняецца прыкладна тры пакаленні людзей. У такім выпадку наша **Я** атрымала спадчыну ад дзесяці пакаленняў. Яны на працягу стольких гадоў "ляпілі" сённяшняга цябе, мяне, яго, яе… Ці апраўдваем іх давер?(*У.Ліпскі*)

<u>Пытанні і заданні вучням</u>**:**

– Як вы вызначыце тып тэксту? Абгрунтуйце сваю думку (*разважанне, бо ў першым сказе аўтар выказвае думку, а потым разважае і прыводзіць доказы*).

– Як разумееце апошні сказ тэксту?

– Чаму вучаць нас нашы продкі? (*Помніць сваіх бацькоў і дзядоў, захоўваць спадчыну…)*

– Згодны з аўтарам, што кожнае чалавечае жыццё – Кніга?

– Якое значэнне мае слова "**Я**" ў тэксце?( *Я – асоба.*)

– Да якой часціны мовы яно адносіцца? ( *Займеннік*)

– Назавіце ў тэксце іншыя займеннікі, якія ўказваюць на асобу ( я*, ты, ён, яна).*

– Вызначце сінтаксічную фунцыю займеннікаў у першым сказе *(дзейнік).*

**II. Аперацыйна-пазнавальны этап**.

1. Работа з тэарэтычным матэрыялам (параграф 65, с. 200, прыём "Дапоўні сказ"):

– Прачытаць параграф і дапоўніць сказы:

Займеннік – гэта… ____________________ часціна мовы,

якая… ________________________________________________________

а толькі… _____________________________________________________

ужываецца замест… _____________________________________________.

Усе займеннікі змяняюцца па…______________________________________

могуць змяняцца па… ___________________________________________.

сінтаксічная роля ў сказе… ________________________________________

пачатковая форма … ______________________________________________

разрады (*гл. с. 202 – зачытаць назвы разрадаў і прыклады*)

**Узор выканання**:

*– Займеннік – гэта часціна мовы,*

*– якая не называе прадметы, прыметы, колькасць, а толькі указвае на іх;*

*– ужываецца замест назоўніка, прыметніка, лічэбніка;*

*– усе займеннікі змяняюцца па склонах;*

– *могуць змяняцца па родах і ліках;*

*– сінтаксічная роля ў сказе – усе члены сказа;*

– *пачатковая форма – назоўны склон, адзіночны лік.*

*– разрады: асабовыя, зваротны, пытальныя, адносныя прыналежныя, указальныя, азначальныя, няпэўныя, адмоўныя.*

**2.Засваенне новых ведаў і спосабаў дзеяння.**

Вучні працуюць у парах, запісваюць прыказкі.

Растлумачыць сэнс прыказак, уставіць па сэнсе займеннікі і вызначыць іх сінтаксічную функцыю.

Прыказкі:

1 рад. Зямля ***нас*** (*дапаўненне*) корміць, але есці ***ні ў кога ( дапаўненне)*** не просіць

2 рад**. Усякай** (*азначэнне*) птушцы **сваё** (*азначэнне*) гняздо міла.

3 рад**. Кожная***(азначэнне)* сасна спявае песню **свайму** (азначэнне) бору**.**

**2. Заданне "Збяры прыказку"**. (*Дзевяць вучняў атрымліваюць карткі са словамі, знакамі прыпынку, выходзяць да дошкі і кожны становіцца так, каб атрымаўся выраз.*

**Той** Бацькаўшчыну любіць, **хто ёй** сумленна служыць.

Растлумачыць сэнс выслоўя, назваць займеннікі, вызначыць разрад і сінтаксічную функцыю займеннікаў.

**3. Вусна** перакласці сказ на беларускую мову:

К**а**ждый год с 15 ноября по 15 декабря в наш**е**й стране проходит акция "Сбережём природные ресурсы и электроэнергию". (*Сказ запісаны на дошцы ці на картках*).

*(Узор: К**о**жны год з 15 лістапада па 15 снежня ў наш**а**й краіне праходзіць акцыя "Зберажом прыродныя рэсурсы і электраэнергію").*

*День Земли* является праздником чистой Земли, Воды и Воздуха. В этот день вспоминают об экологических катастрофах, люди задумываются о том, что могут сделать для решения таких проблем, преодолев свое равнодушие..

– Ці адрозніваецца напісанне займеннікаў у рускай і беларускай мовах? Растлумачце правапіс займеннікаў.

**ІІІ. Кантрольна – ацэначны этап**

Праца ў групах. (*Вучні атрымліваюць карткі з тэкстам, лісты паперы, рознакаляровыя маркеры, фламастары*). Ужываючы розныя займеннікі, адказваюць на пытанні, запісваюць на лістах).

**Група 1. Работа з тэкстам "Гамані, лес!"**

Гамані, лес, пакуль стаіш. Чаруй сваімі незлічонымі фарбамі і іх адценнямі. Але сцеражыся неразумных чалавечых дзеянняў. Усё жывое тваё асцерагаецца чалавека. І не без прычыны. Чалавек падыходзіць да дрэва з сякерай. Яно пачынае трапятаць лісцем. Птушка адводзіць чалавека ад гнязда свайго, знарок рызыкуе сабой. Звер пазбягае перасячэння сваіх і людскіх сцежак. Самае небяспечнае для цябе – чалавек. Ён бярэ ў цябе ўсё, што ты можаш даць. Ён бярэ ў шмат разоў больш, чым можна спажыць. Адсюль беды твае і ўсёй прыроды. (*Паводле У.Саламахі.*)

Заданні вучням:

1) прачытайце тэкст, вызначце асноўную думку (для чаго?);

2) вызначце займеннікі і іх разрад у 1-4 сказах;

3) растлумачце выраз: ***Але сцеражыся неразумных чалавечых дзеянняў;***

4) уявіце, што вы дрэвы ў лесе. Якія пачуцці ўзнікаюць у вас? Апішыце свае

эмоцыі, ужываючы займеннікі.

**Група 2**. **Работа з тэкстам “Зямля – карміцелька”**

Зямля – карміцелька. У чым жа яе сіла? ________ў верхнім цёмна-шэрым ці карычневым слоі, які пакрывае тоўшчу безжыццёвага грунту. Гэта – глеба. **Яна** корміць і поіць ________ **р**аслінны свет, а значыць жывёл, чалавека. Глеба служыць месцам жыцця многіх відаў жывёл. Яны рыхляць ________, робяць пранікальнай для вады і паветра. Ахоўвайце __________ зямлю-карміцельку.

Заданні вучням:

1) прачытайце тэкст, уставіўшы прапушчаныя займеннікі (*словы для даведак: яе, нашу, яна, увесь*);

2) вызначце асноўную думку ( для чаго?);

3) сфармулюйце 2-3 законы па ахове зямлі.

**Група 3. Работа з тэкстам “Як весці сябе ў прыродзе?”**

Не рвіце без патрэбы кветак. Яны вельмі цудоўныя ў полі, на вадзе. Не высякайце без патрэбы дрэвы і кусты. Не забруджвайце лясныя паляны, берагі рэк і вадаёмы паперай, бляшанкамі, анучамі, шклом. Не рзбурайце мурашнікі, гнёзды птушак, жыллё другіх жывёл. Беражліва адносцеся да ўсіх жывёл. Не бярыце яек з гнёздаў. Калі выпадкова раскрылі гняздо – аднавіце яго маскіроўку. Захоўвайце правілы палявання і рыбалоўства. Не пакідайце сваіх слядоў у выглядзе надпісаў. Будзьце актыўнымі абаронцамі прыроды. **Выхоўвайце ў сябе і ў другіх беражлівыя адносіны да яе.**

Заданні вучням:

1) прачытайце тэкст, вылучыце асноўную думку;

2) назавіце займеннікі ў тэксце;

3) вызначце сінтаксічную функцыю займеннікаў у апошнім сказе;

4) сфармулюйце правілы адпачынку (на аснове тэксту) на прыродзе.

**Група 4. Работа з тэкстам “ Дзень Зямлі”**

22 красавіка адзначаецца Дзень Зямлі. Ідэя правядзення экалагічнага свята належыць амерыканскаму вучонаму. Упершыню акцыя прайшла ў ЗША ў 1990 годзе. Яна сабрала дваццаць мільёнаў чалавек. Удзельнікі чыталі лекцыі па ахове прыроды, саджалі дрэвы. У 1990 годзе Дзень Зямлі стаў міжнародным. У гэты дзень кожны можа дапамагчы прыродзе, сваёй планеце. Звычайна Дзень Зямлі святкуецца 22 красавіка. Але многія адзначаюць Тыдзень Зямлі ці Месяц Зямлі. Нехта святкуе яго ў дзень вясенняга раўнадзенства 21 сакавіка. А нехта 5 чэрвеня ў Дзень аховы навакольнага асяроддзя. На самай справе кожны дзень павінен стаць Днём Зямлі! (*Паводле І. Бышнёва.*)

Заданні вучням:

1) прачытайце тэкст, вызначыце тэму і асноўную думку.

2) дапоўніце сказ, ужываючы займеннікі: У гэты дзень я далучуся да акцыі і…

3) Я параю сваім аднакласнікам…

*Вучні прымацоўваюць лісты з рэкамендацыямі на дошцы, агучваюць матэрыял. Астатнія ўважліва слухаюць і дапаўняюць. Фармулююць асноўныя правілы беражлівага стаўлення да Зямлі.*

<u>Пытанні вучням:</u>

– Якая работа праводзіцца ў гімназіі па зберажэнні прыродных рэсурсаў? (*праводзяцца акцыі "Чысты вадаём", "Пасадзі дрэўца, кветку", "Чысты лес", "Чысты бераг возера", "Дадзім другое жыццё адходам", збор макулатуры, збор батарэек…)*

– У якіх акцыях вы прымалі ўдзел?

**IV. Рэфлексійны этап**

Ці ўдалося дасягнуць пастаўленай мэты?

З урока я даведаўся…

На ўроку я задумаўся

Цяпер я ведаю, што….

Цяпер я буду (змагу)…

**V. Дамашняе заданне**

Параграф 65.

Заданне на выбар:

Пр.414 ці пр.416

**Крыжаванка па тэме "Разрады займеннікаў"**

**<u>https://learningapps.org/1018243</u>**

Заданне на выбар (9–10 б.):

1. Напісаць пісьмо – пасланне чалавеку ад імя расліны, жывёлы ці птушкі, ужываючы займеннікі.

2. Прыдумаць для жыхароў горада (вёскі) 5-6 мерапрыемстваў, акцый да Дня Зямлі, ужываючы займеннікі.

**Настаўнік**. "Дзень Зямлі – кожны дзень!". Такі дэвіз павінен быць у кожнага з нас. Дух Дня Зямлі заключаецца ў тым, каб зрабіць клопат аб навакольным асяроддзі штодзённай звычкай. Такія простыя дзеянні, як перапрацоўка, эканомія вады і скарачэнне спажывання электраэнергіі, могуць аказаць значны ўплыў на экалогію, калі іх пастаянна выконваць. Мы павінны клапаціцца пра ўсё жывое на зямлі, пра будучыню дзяцей, пра будучыню нашай планеты…

*"Сябры, давайце будзем хваляваць*

*За ўсіх, за ўсё: за зерне і дзіця…"(П.Панчанка).*

**Літаратура**

1. Беларуская мова: навучальныя і кантрольныя дыктанты 5-9 класы: дапам. для настаўнікаў устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / Г.М. Валочка [і інш.] – Мінск : Аверсэв, 2012. – 224 с.
2. Валочка, Г. М. Беларуская мова: вучэб. дапам. для 6-га класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання/ Г. М. Валочка, В. У. Зелянко, С. В. Мартынкевіч. – Мінск: Нацыянальны інстытут адукацыі, 2020. – 238 с.